Надвор'е

# І зноў гарачыня за 30

## А ў нядзелю нас чакаюць моцныя ліўні

**Пасля нядоўгачасовага прахалоднага перапынку ў нашу краіну зноў вярнулася цяпло. А па захадзе краіны — гэта ўжо не проста цяпло, а амаль пекла. Але, пачынаючы з апошняга дня тыдня, да нас прынясе чарговую порцыю дажджоў атмасферны фронт з Заходняй Еўропы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ужо на гэтым тыдні надвор'е зноў стане летнім: тэмпературны фон павышаецца і набліжаецца да значэнняў, характэрных для трэцяй дэкады ліпеня, а па паўднёвым захадзе краіны і зусім перавышае іх на 1-2 градусы.



У пятніцу чакаецца цёплае, а па захадзе краіны вельмі цёплае надвор'е. Тэмпературны фон будзе ў асноўным на 1—4 градусы, а па захадзе месцамі на 5-6 градусаў перавышаць кліматычную норму. Пры павышаным фоне атмасфернага ціску істотных ападкаў не прагназуецца. Вецер пераменных напрамкаў ад слабога да ўмеранага. Максімальная тэмпература паветра будзе дасягаць плюс 25—30 градусаў, па захадзе Беларусі чакаецца 31—33 цяпла.

У суботу з тэрыторыі Польшчы на заходнія раёны нашай краіны пераместціцца атмасферны фронт, які абумовіць уначы па захадзе, а раніцай і днём месцамі па краіне кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Ноччу тэмпература паветра будзе вагацца ад 12 градусаў да 19 цяпла. Удзень тэмпература паветра складзе плюс 24—30 градусаў, а па поўдні дасягне адзнакі плюс 32 градусы.

Такая раптоўная спёка без анамальных дажджоў не абыходзілася ніколі. У нядзелю характар надвор'я зменіцца. Беларусь акажацца ў зоне актыўных атмасферных франтоў, таму на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца дажджы. Месцамі яны будуць вельмі моцнымі і суправаджацца навальніцамі. Днём пры навальніцах чакаецца ўзмацненне ветру да моцнага парывістага. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 14—20 градусаў, а ўдзень будзе вагацца ад плюс 19 градусаў па паўночным захадзе да плюс 30 градусаў па паўднёвым усходзе краіны.

У панядзелак спякота часова адступіць. У гэты дзень зона атмасфернага фронту будзе размяшчацца на ўсходняй частцы краіны і тут пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі яны будуць спалучацца з навальніцамі. Пры гэтым уначы тэмпература паветра складзе плюс 11—17 градусаў, а ўдзень чакаецца 20—27 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак фон атмасфернага ціску падрасце і надвор'е прагназуецца пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 10 да 16 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 23—28 градусаў, а на паўднёвым захадзе да 30 градусаў цяпла. У сярэдзіне наступнага тыдня чарговы атмасферны фронт з Заходняй Еўропы прынясе новую порцыю дажджоў. Пры гэтым захаваецца цёплае надвор'е з тэмпературным фонам каля кліматычнай нормы і на 1—4 градусы вышэйшым.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.07 | 21.24 | 16.17 |
| Віцебск — | 4.50 | 21.21 | 16.31 |
| Магілёў — | 4.57 | 21.15 | 16.18 |
| Гомель — | 5.01 | 21.03 | 16.02 |
| Гродна — | 5.24 | 21.38 | 16.14 |
| Брэст — | 5.32 | 21.31 | 15.59 |

## Месяц

*Апошняя квадра 20 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Кірылы, Панкрата, Фёдара.*
***К.** Марыі, Магдалены, Лаўрэнція.*

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Пра які выбар прафесіі можа ісці гаворка, калі я выбіраю, які фільм паглядзець, даўжэй, чым яго гляджу?**

— А вы сэрцаедка!
— Ну што вы! Я аддаю перавагу мазгам...

**Калі ў мяне ёсць вольны час, я ляжу і адпачываю, а калі яго няма — я проста ляжу, але з трывогай.**

Канікулы — гэта калі ты засынаеш у 5 гадзін раніцы, а прачынаешся ў 5 гадзін вечара.

**З аднаго боку я выглядаю добра, а з другога боку — твар.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 22 ЛІПЕНЯ

У краіне

**1852** год — нарадзілася (в. Баландзічы, цяпер у Іванаўскім раёне) Марыя Магдалена Эліза Бутаўт-Андрайковіч, беларуская мастачка. У 1860-я гады вучылася жывапісу ў Мюнхене, падарожнічала па Італіі. Працавала пераважна ў гістарычным жанры, пісала карціны і на рэлігійныя сюжэты. Сярод іх: «Хрыстос вылечвае сляпога», «Міласэрнасць каралевы Ядвігі» і іншае. У 1870—1880-я гады удзельнічала ў выставах у Мюнхене, Кракаве, Варшаве. Займалася таксама асветніцкай дзейнасцю і філантропіяй, адна з першых збіральніц твораў народнага мастацтва.

**1895** год — нарадзіўся (г. Глыбокае) Павел Восіпавіч Сухі, вядомы савецкі авіяканструктар. Стварыў баявы мнагамэтавы самалёт Су-2, браніраваны штурмавік Су-6. Адзін са стваральнікаў айчыннай рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі, двойчы Герой Сацыялістычнай працы, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР. Аўтар 50 арыгінальных канструкцый самалётаў, больш за 30 з якіх было пабудавана і выпрабавана. На яго машынах устанаўлівалі сусветныя рэкорды хуткасці і вышыні палёту, знішчалі ворага ў гады Вялікай Айчыннай вайны. І сёння самалёты маркі «Су» добра вядомыя ў блізкім і далёкім замежжы. На ўездзе ў горад Глыбокае ў 1996 годзе ўстаноўлены памятны знак — самалёт-знішчальнік Су-17, прысвечаны яго стваральніку.



**1941** год — кавалерыйская група генерала А. І. Гарадавікава нанесла контрудар па нямецкіх войсках, фарсіравала раку Пціч, вызваліла гарады Глуск, Старыя Дарогі, Асіповічы; ліквідаваць гэты прарыў гітлераўцы змаглі толькі 27 ліпеня, падцягнуўшы тры дывізіі.

**1942** год — нарадзіўся Рыгор Фёдаравіч Сурус, кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Сярод твораў: музычная камедыя «Несцерка», вакальна-сімфанічная паэма «Памяці герояў», «Святочная ўверцюра», «Святочны вальс», апрацоўкі беларускіх народных песень, рамансы, песні.

У свеце

**1099** год — крыжаносцамі створана Іерусалімскае каралеўства, першым кіраўніком дзяржавы («абаронцам Гроба Гасподня») абраны герцаг Бульёнскі.

**1502** год — у Лісабон вярнуліся ўдзельнікі партугальскай экспедыцыі, у якой у якасці астранома браў удзел Амерыга Веспучы. Гэтае плаванне прынесла яму сусветную славу як першаадкрывальніку Новага Свету, як тады называлі Паўднёвую Амерыку, якая ляжала на поўдзень ад экватара.

**1596** год — нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч Раманаў, рускі цар, першы з дынастыі Раманавых. У 1613 годзе па ініцыятыве баярства абраны на прастол на Земскім саборы. Ужо першыя гады яго кіравання адзначаны дыпламатычным поспехам: яму, хоць і з вялікай цяжкасцю, удалося заключыць мірныя дагаворы са Швецыяй і Польшчай, што дало яго дзяржаве часовую перадышку ў бесперапынных тэрытарыяльных войнах. Пры ім склікаліся земскія саборы, але асноўныя палітычныя пытанні цар вырашаў сумесна з думай. Правіў да 1645 года.

**1894** год — у Францыі прайшлі першыя аўтамабільныя спаборніцтвы, арганізаваныя газетай Le Petit Journal: 102 удзельнікі выйшлі на старт гонкі Парыж — Руан працягласцю 126 км. Перамог аўтамабіль маркі De Dion-Bouton маркіза Жуля-Альбера дэ Дзьёна, аднак прыз яму не быў уручаны, бо суддзі палічылі, што наяўнасць качагара ў аўтамабілі не адпавядала правілам гонкі.

**1922** год — у сувязі з забаронай выступаць на Алімпіядзе Германія правяла альтэрнатыўныя Гульні ў Лейпцыгу.

Так гаварыў...

**ІВАН ШАМЯКІН:**

*«Усе радасці жыцця кароткія, акрамя адной — радасці працы».*







ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1733.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 ліпеня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12